**Алена Бурык**

# ПРЫГРАНІЧНАЕ СУПРАЦОЎНІТЦВА БЕЛАРУСІ І ПОЛЬШЧЫ Ў ЭКАНАМІЧНАЙ СФЕРЫ Ў 1990-Я ГГ

У артыкуле разглядаецца станаўленне і развіццё беларуска-польскага прыгранічнага супрацоўніцтва ў эканамічнай вобласці ў першае постсацыялістычнае дзесяцігоддзе. Аўтар вызначае асноўныя формы ажыццяўлення эканамічных сувязяў, характарызуе сацыяльна-эканамічныя ўмовы развіцця прыгранічных рэгіёнаў. Зроблены акцэнт на неаднолькавы эканамічны патэнцыял памежных тэрыторый Беларусі і Польшчы, які з'явіўся стымулам актывізацыі прыгранічнага супрацоўніцтва. Паказаны працэс інстытуцыялізацыі прыгранічнага супрацоўніцтва, найбольш дасканалай і ўніверсальнай формай якога сталі еўрарэгіёны. Адзначана, што значная роля ў пашырэнні гандлёвых кантактаў належала такім эканамічным інстытутам як сумесныя гандлёвыя дамы, біржы, гандлёва-прамысловыя палаты. Аўтар аналізуе праблемы і стрымліваючыя фактары развіцця гаспадарчых сувязяў, падкрэсліваючы, што асноўным бар'ерам для ўзаемных стасункаў стаў жорсткі мытны і пагранічны рэжым.

## Уводзіны

Беларусь і Польшча – краіны-суседкі, якіх спрадвечна звязвалі цесныя адносіны, як правіла, заснаваныя на прынцыпах раўнапраўя і ўзаемнай павагі. У пачатку 90-х гг. XX ст., ва ўмовах разгортвання працэсу суверэнізацыі былых рэспублік СССР, Беларусь атрымала магчымасць самастойна праводзіць знешнюю палітыку. Яе першачарговай задачай стала наладжванне разарваных з-за распаду Савецкага Саюза двухбаковых эканамічных сувязяў на парытэтнай аснове. Неад'емнай часткай знешнеэканамічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь выступала прыгранічнае супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы,

якое набыло прагматычны характар і ўлічвала інтарэсы абедзвюх памежных краін.

Натуральна, у польскіх дзяржаўных і грамадскіх колах такая палітыка ацэньвалася як надзвычай карысная і патрэбная. Юрыдычнай асновай для развіцця прыгранічнага супрацоўніцтва з'яўляліся міждзяржаўныя і міжведамасныя дагаворы, у якіх бакі выказваліся за неабходнасць развіцця прыгранічных сувязяў, а таксама пагадненні, падпісаныя на рэгіянальным узроўні. Апошнія рэгламентавалі і канкрэтызавалі ўмовы, тэрміны і вобласці супрацоўніцтва. Адначасова эфектыўным інструментам садзейнічання развіццю гандлёва-эканамічных сувязяў паміж дзвюма краінамі ў пачатку 1990-х гг. станавілася ўнутранае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у прыватнасці, законы "Аб асновах знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь" (25.10.1990), "Аб замежных інвестыцыях на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь" (14.11.1991), пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь "Аб мерах па развіццю гандлёва-эканамічных адносін з Рэспублікай Польшча" (18.11.1991) і інш.

Памежнае эканамічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Польшчай развівалася на фоне дынамічнага разгортвання міждзяржаўных адносін, што, безумоўна, з'яўлялася стымулюючым фактарам для наладжвання больш цесных кантактаў. Яно імкнулася да замацавання ўжо ўсталяваных гаспадарчых сувязяў, арыентавалася на пошук новых форм узаемадзеяння. Галоўнымі паказчыкамі развіцця памежнага супрацоўніцтва з'яўляліся геаграфічная блізкасць суб'ектаў гаспадарання, мінімізацыі выдаткаў на транспарціроўку прадукцыі, добрая ўзаемадасведчанасць адносна попыту і прапановы на суседнім рынку, магчымасць выкарыстання агульных тэхналогій у падобных прыродна-кліматычных умовах, агульнасць транспартнай інфраструктуры.

Беларуска-польскае супрацоўніцтва ў 1990-я гг. паступова набывала характэрныя для Еўропы трансгранічныя абрысы. Ім уласцівыя паняцці "прыгранічча" і "трансгранічча". Прыгранічча ўтварае прыгранічны рэгіён – тэрыторыя адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, што непасрэдна прылягаюць да дзяржаўнай мяжы краіны. Пад прыгранічным супрацоўніцтвам разумеюцца любыя ўзгодненыя дзеянні, накіраваныя на ўмацаванне і заахвочванне добрасуседскіх адносін паміж прыгранічнымі тэрыторыямі, заключэнне ў адпавед-

насці з заканадаўствам бакоў пагадненняў, неабходных для дасягнення гэтых мэт[1]. Прыгранічнае супрацоўніцтва ажыццяўляецца ў межах паўнамоцтваў тэрытарыяльных уладаў, якія, у сваю чаргу, вызначаюцца ўнутраным заканадаўствам кожнай з краін. У дадзеным выпадку аб'ектам прыгранічнага эканамічнага супрацоўніцтва з беларускага боку з'яўляліся Брэсцкая і Гродзенская вобласці. Трансгранічча ж аб'ядноўвае ў геаграфічным сэнсе больш шырокія тэрыторыі дзвюх або некалькіх краін і часта з'яўляецца вынікам узаемадзеяння прыгранічных тэрыторый. У сувязі з гэтым дадзеныя паняцці часам атаясамліваюцца. Аднак выдзяляць трансгранічча як асобны рэгіён немэтазгодна; яго лагічна трактаваць як форму разнапланавых узаемаадносін, пры якіх дзве сумежныя краіны ўзгадняюць і ажыццяўляюць непасрэднае кіраванне груза- і пасажырапатокамі, а таксама забяспечваюць свабодны транзіт праз сваю краіну тавараў, паслуг, капіталаў, людзей на тэрыторыю краіны-партнёра. Фундаментам трансгранічча з'яўляюцца разнапланавыя сувязі паміж краінамі-суседзямі, што складваліся працяглы час і рэалізоўваліся праз іх тэрыторыі.

Мэта дадзенага артыкулу заключаецца ў даследаванні працэса станаўлення і развіцця беларуска-польскага прыгранічнага супрацоўніцтва ў эканамічнай вобласці, выяўленні асноўных форм і накірункаў гаспадарчых сувязяў памежных тэрыторый у 1990-я гг.

## Пашырэнне бартэра як формы ажыццяўлення эканамічных кантактаў

З пачатку 1990-х гг., ва ўмовах надзвычай нестабільных фінансавых сістэм абедзвюх краін, адной з распаўсюджаных форм эканамічнага супрацоўніцтва памежных тэрыторый аказаўся бартэрны абмен. Бартэрныя здзелкі таксама былі вынікам дэфіцытнай эканомікі СССР канца 1980-х гг. і сталі ўвогуле характэрнымі для эканамічнага супрацоўніцтва на міждзяржаўным узроўні. Ва ўмовах эканамічнага крызісу, неўрэгуляванасці сістэмы ўзаемных разлікаў, адсутнасці ва-

[1] Европейская рамочная конвенция о приграничном сотрудничестве территориальных сообществ и властей, Мадрид, 21 мая 1980 г. СДСЕ №: 106 // Совет Европы: Бюро договоров, http://conventions.coe.int/treaty/rus/Treaties/Html/106.htm (27.01.2010).

лютных сродкаў у краіне праблемы паставак па імпарту вырашаліся коштам тавараабмену на збалансаванай безвалютнай аснове. Яшчэ ў межах СССР мелі месца тавараабменныя аперацыі, што ажыццяўляліся ў першую чаргу Дзяржкамітэтам па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні, Міністэрствам гандлю і Цэнтральным саюзам спажывецкіх таварыстваў СССР. У 1989 г. на зварот беларускага ўрада Савет Міністраў СССР адказаў дазволам праводзіць бартэрныя аперацыі рэспубліканскаму знешнеэканамічнаму дзяржразліковаму аб'яднанню "Белагразнешгандаль", падпарадкаванаму Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання БССР. Такім чынам, Беларусь атрымала пэўную самастойнасць у правядзенні знешнегандлёвых аперацый. Так, у 1989 г. па асартыментным тавараабмене з Польшчай было дастаўлена і атрымана каля 7 тыс. тон плодаагародніннай прадукцыі, а ў 1991 г. такія ўзаемапастаўкі склалі 12,5 тыс. тон[2].

Тавараабменныя аперацыі паміж дзвюма краінамі ажыццяўляліся ў розных сферах эканомікі і ахоплівалі дастаткова шырокі пералік тавараў: прадукты сельскай гаспадаркі, мяса-малочнай прамысловасці, мінеральныя ўгнаенні, сыравіну, машыны і тэхнічнае абсталяванне, тавары народнага спажывання. Так, у 1990 г. з Беларусі ў Польшчу былі пастаўлены трактары, экскаватары, аўтамабільныя прыцэпы, прылады і запасныя часткі да сельскагаспадарчых машын і абсталявання, шпагат упаковачны на суму 4728 тыс. інвалютных рублёў (інв. руб.). Узамен былі атрыманы аўтамабільныя акумулятары, камбайны, бульбакапалкі, прэс-падборшчыкі, жняяркі, запасныя часткі да сельскагаспадарчых машын на суму 1663 тыс. інв. руб., а таксама халадзільныя прылаўкі, устаноўкі і камплектуючыя вузлы да абсталяванна для перапрацоўкі мяса на суму 254 тыс. інв. руб., памнажальная і вылічальная тэхніка на суму 122 тыс. руб.[3]

Пазней сфера бартэрных здзелак пашырылася. У лютым 1992 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастановы «Аб квацiраванні і ліцэнзаванні экспарту і імпарту тавараў (работ, паслуг) на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у 1992 г.» і «Аб фарміраванні валютных фондаў у 1992 г.». Згодна з імі тавараабменныя здзелкі дазвалялася ажыццяўляць усім прадпрыемствам, незалежна ад падпарадкаванас-

---

2 Документы о постановке предприятиями и организациями республики продукции на экспорт (справки, информации, сведения), т. 1, Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), фонд 7, оп. 12, д. 417, л. 61.

3 Ibidem.

ці і форм уласнасці на аснове дазволаў, што выдаваліся Дзяржаўным камітэтам па знешніх эканамічных сувязях Рэспублікі Беларусь[4]. Зразумела, што дадзеныя дакументы, з аднаго боку, спрыялі актывізацыі бартэрных аперацый, а з другога – панізілі аператыўнасць іх ажыццяўлення, паколькі патрабаваўся пэўны час на атрыманне дазволу для правядзення кожнай запланавай здзелкі.

Тым не менш, дадзеная форма эканамічнага супрацоўніцтва прыкметна ўмацавалася і значна распаўсюдзілася найперш у прыгранічных Гродзенскай і Брэсцкай абласцях Беларусі, дзе дадатковымі фактарамі яе распаўсюджання з'явіліся традыцыйнасць гаспадарчых кантактаў, веданне гаспадарчых інтарэсаў польскіх прадпрымальнікаў і тэрытарыяльная блізкасць. Найчасцей аб’ектамі абмену з беларускага боку станавіліся буйная рагатая жывёла, прадукты жывёлагадоўлі, карбамід, казеін. Напрыклад, казеін у межах краіны ўжываўся ў невялікай колькасці, у асноўным для вытворчасці клею, а на сусветным рынку, наадварот, карыстаўся вялікім попытам. Ён выкарыстоўваўся для вырабу фарбаў, штучных валокнаў, пластмас, дарожных пакрыццяў, паперы. Буйнейшымі экспарцёрамі казеіна выступалі “Белагразнешгандаль” і Брэсцкае абласное аб’яднанне па вытворча-тэхнічным абслугоўванні аграпрамысловага комплексу. Польскі бок узамен пастаўляў у асноўным суперканцэнтраты кармоў для жывёл, тэхнічнае і машыннае абсталяванне, якія ў Беларусі каштавалі дастаткова дарага. Так, у 1992 г. у выніку абмену 20 тыс. тон карбаміду Гродзенскае ўпраўленне сувязі атрымала з Польшчы аўтаматычную тэлефонную станцыю тыпу «Пентаконта» на 10 тыс. нумароў, якая каштавала на той час 120 млн. руб., а ў выніку бартэрнай аперацыі абышлася ў 2 разы таней[5]. Станцыю выкарысталі для тэлефанізацыі мікраераёна «Вішнявец» г. Гродна. Наваельнянскі міжраённы аграпрамысловы аддзел забеспячэння Гродзенскай вобласці і польскае прадпрыемства «SVIT» у 1994 г. заключылі кант-

[4] Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 03.02.1992 N 50 «О квотировании и лицензировании экспорта и импорта товаров (работ, услуг) на территории Республики Беларусь в 1992 году» // Режим доступа: http://www.pravoby.info/docum09/part36/akt36068.htm. – Дата доступа: 13.04.2011; Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 06.02.1992 N 63 «О формировании валютных фондов в 1992 году» http://www.pravoby.info/docum09/part36/akt36063.htm (13.04.2011).

[5] Документы о рассмотрении вопросов создания совместных предприятий и их внешнеэкономической и организационно-хозяйственной деятельности (проекты распоряжений, приказы, переписка и др.), т. 1, НАРБ, фонд 7, оп. 12, д. 411, л. 145.

ракт на бартэрны абмен 10,0 тон сухога малака на 212 акумулятарных батарэй для тэхнікі па ўборцы ўраджаю[6]. Гэтыя тавары можна было набыць і ў межах СНД, аднак іх кошт і дастаўка абышліся б значна даражэй, улічваючы геаграфічную аддаленасць ад заходняга пагранічча Беларусі.

Ва ўмовах цяжкага эканамічнага стану краіны, нізкай плацежаздольнасці насельніцтва бартэрны абмен з'яўляўся часам адзіным спосабам набыцця неабходных тавараў для паўсядзённага ўжытку. Таму для насельніцтва прыгранічных тэрыторый бартэр стаў жыццёва неабходнай формай узаемасувязяў. Асабліва гэтаму спрыяла розніца цэн на тавары народнага спажывання, а таксама алькагольныя вырабы, тэле- і радыётэхніку, электрычныя і гаспадарчыя тавары. Практычна ва ўсіх польскіх прыгранічных гарадах існавалі бартэрныя рынкі, на якіх абменьваўся даволі шырокі асартымент тавараў. Напрыклад, у 1990 г. жаночыя туфлі каштавалі 4–5 бутэлькі водкі, а дзіцячыя боты можна было набыць за электрасамавар[7].

## Сацыяльна-эканамічныя ўмовы прыгранічнага супрацоўніцтва

Калі к сярэдзіне 1990-х гг. у польскай эканоміцы назіраліся станоўчыя з'явы, што сведчылі аб яе росце, то для эканомікі суседняй Беларусі пасля распаду СССР быў характэрны глыбокі эканамічны крызіс, выкліканы перапыненнем агульнасаюзных сувязяў. Неаднолькавы эканамічны патэнцыял прыгранічных тэрыторый Беларусі і Польшчы выступаў стымулам развіцця гаспадарчых кантактаў. Эканамічная карысць была відавочнай для абодвух бакоў і выражалася для адных – у знаходжанні новага пакупнога асяроддзя, задаволенага прапануемай прадукцыяй, а для другіх – атрыманнем больш танных тавараў і паслуг. Найбольш спрыльяны фон для актывізацыі прыгранічнага бізнесу стваралі розніца цэн на тавары і паслугі, а так-

6 Переписка с Советом министров РБ по вопросам удовлетворения культурных потребностей польского национального меньшинства в Беларуси, развития электротранспорта, использования высвобождающихся военных городков и др. // Государственный архив Гродненской области, фонд 1171, оп. 5, д. 2970, л. 300.

7 Бартерный … праздник дружбы [в:] „Заря", 1990, 21 сентября.

сама ўзровень заработных плат, ад якой залежала пакупная здольнасць мясцовага насельніцтва. Гэтыя фактары, а таксама адсутнасць візавага рэжыму паміж дзвюма краінамі абумовілі развіццё чаўночнага бізнесу паміж мясцовым насельніцтвам, калі ў Польшчу масава вывозіліся танныя тавары айчыннай вытворчасці і набываліся там замежныя рэчы. Асноўныя тавары, якія карысталіся попытам за блізкай мяжой, складалі нешырокі асартымент: тытунёвыя і алкагольныя вырабы, галоўным чынам спірт, а таксама аўтамабільнае паліва. У Беларусі сярэдні кошт 1 літра бензіну ў 1995 г. складаў 2125 руб. або 0,18 дол. ЗША, у 2000 г. – 232,4 руб. або 0,21 дол.[8]. У Польшчы ж ён каштаваў у 1997 г. 1,54 злотых (0,51 дол.), у 2000 г. – 3,09 злотых (0,77 дол.) за літр. Такім чынам, беларус толькі на продажы 50 літраў бензіну зарабляў каля 30 долараў. Дастаўка аўтамабільнага паліва ў Польшчу ажыццяўлялася галоўным чынам на асабістым транспарце, таму колькасць прадаўцоў гэтага тавару абмяжоўвалася ўласнікамі транспартных сродкаў. А вось катэгорыя прадаўцоў алкаголю і цыгарэт была значна шырэйшай. Тавар звычайна правозілі на маршрутных аўтобусах і цягніках, размяшчаючы яго ў сумках і хаваючы лішнюю норму на сабе. Напрыклад у 2000 г. гарэлка ў Польшчы каштавала 50,8 злотых (12,7 дол. ЗША) за літр, а ў Беларусі яе набывалі за 2885 руб. (каля 3 дол.). Рэалізацыя нават мінімальнага аб'ёму дадзеных тавараў дазваляла беларусам прыгранічных абласцей нядрэнна зарабіць. Прычым адзін і той жа беларускі "камерсант", займаючыся чаўночным бізнесам, рабіў за мяжу некалькі паездак у суткі. Разам з цэнамі значна адрозніваліся і ўзроўні заработных плат па абодва бакі мяжы. Па Беларусі сяэднемесячная зарплата ў 1995 г. складала 755100 руб. (65,7 дол. ЗША), у 2000 г. – 58900 руб. (55 дол.), прычым Брэсцкая і Гродзенская вобласці, як правіла, пастаянна адставалі ад іншых рэгіёнаў Беларусі па ўзроўні зарплат. Таму чаўночны бізнес станавіўся асноўным дадатковым заробкам прыгранічнага насельніцтва. З Польшчы ў Беларусь было выгадна прывезці прадукты харчавання, мэблю, сантэхніку, абутак, мехавыя, скураныя і трыкатажныя вырабы. Іх кошт на Беларусі быў несувымерна вялікі адносна мясцовых зарплат. Напрыклад, сярэдні кошт жаночых зімовых ботаў у 1995 г. быў 494530 руб. або 43 дол. ЗША[9].

---

8 Цены в Беларуси 1991–2005 : статистический сборник / Министерство статистики и анализа Респ. Беларусь, Минск 2006, с. 167.

9 Ibidem, с. 90.

Тавары, якія вывозіліся і ўвозіліся “чаўнакамі”, на мытні не дэклараваліся і таму афіцыйнай справаздачай не ахопліваліся. У сувязі з гэтым дакладныя маштабы чаўночных знешнегандлёвых патокаў прасачыць не ўяўляецца магчымым. Тым не менш, чаўночны абарот быў даволі значным на працягу 1990-х гг., аб чым сведчылі перапоўненасць цягнікоў і аўтобусаў, што рухаліся ў Польшчу, і шматкіламетровыя чэргі пры пагранпераходах на беларуска-польскай мяжы. Па некаторых дадзеных у сярэдзіне 1990-х гг. з Польшчы на Усход вывозілася тавараў на 4,5 млрд. дол. ЗША у год[10]. Аднак з 4 студзеня 1998 г. Рэспубліка Польшча, арыентаваная на інтэграцыю з Захадам, згодна з правіламі Еўрапейскага Саюза ўвяла строга рэгламентаваныя правілы ўезду ў краіну для грамадзян Беларусі і Расіі, а таксама павялічыла ўвозныя пошліны на беларускія тавары. Тым самым польская мяжа ў пэўнай ступені закрывалася, а масавы чаўночны паток прыкметна слабеў.

Інтэнсіўны прыгранічны і транзітны рух праз беларуска-польскую мяжу ў 1990-я гг. стаў сапраўдным выпрабаваннем для мясцовых пагранпераходаў, што будаваліся яшчэ ў савецкія часы і не разлічваліся на павышаныя аб’ёмы эксплуатацыі. Іх нізкія прапускныя здольнасці сталі крыніцай шматлікіх праблем на дзяржаўнай мяжы: аўтамабільныя коркі, шматкіламетровыя чэргі, абурэнне людзей, рост крымінагеннай сітуацыі, абвастрэнне экалагічных праблем, рэзкае пагаршэнне санітарна-эпідэміялагічнага стану на пагранпераходах і прылеглай да іх тэрыторыі. Каб адолець гэтыя праблемы і кампенсаваць затраты на стварэнне сацыяльна-бытавой інфраструктуры, мясцовыя ўлады ў 1994–1995 гг. ўвялі экалагічны і іншыя мясцовыя зборы з уладальнікаў аўтамабільнага транспарту і пасажыраў аўтобусаў пры перасячэнні мяжы[11]. Адначасова з польскага боку супрацоўнікамі органаў самакіравання, прадстаўнікамі мясцовых асацыяцый і фондаў уводзіліся розныя зборы, якія тычыліся толькі іншаземцаў. Напрыклад, у 1999 г. на пагранпераходзе ў Тэрэспалі супрацоўнікі ўпраўлення гміны Тэрэспаль з кожнай асобы пры перасячэнні мяжы збіралі плату ў памеры 1,3 злотых, а прадстаўнікі Асацыяцыі гарад-

[10] М.Э. Часноўскі, *Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989–1999)* / М.Э. Часноўскі, Мінск 2000, с. 242.

[11] Е.А. Бурик, *Проблемы развития пограничных переходов на белорусско-польской границе в первой половине 1990-х гг.* [в:] Веснік Брэсцкага ўніверсітэта, сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права, № 1, Брэст 2011, с. 5–13.

скога развіцця гэтай гміны з кожнай аўтамашыны збіралі 7 злотых, з аўтобуса – 71 злоты. На пагранпераходзе “Славацічы” зборы былі некалькі меншымі: 5 злотых з кожнага аўтамабіля і 1,2 злотых з кожнага чалавека[12]. Нярэдка ў польскія консульствы ў Рэспубліцы Беларусь паступалі скаргі на сістэму спагнання плат з польскага боку, а таксама на недахоп належнай інфармацыі для выязджаючых у Польшчу аб тым, што дадзеныя зборы – добраахвотныя. Насупраць забаронам з боку органаў мясцовага самакіравання супрацоўнікі асацыяцый рабілі выгляд, што зборы – абавязковыя. Грашовыя спагнанні і з беларускага, і з польскага бакоў выклікалі незадаволенасць людзей і перашкаджалі ажыццяўленню прыгранічных кантактаў. Больш таго, залішнія беларускія дарожныя зборы выклікалі ў канцы 1990-х гг. скарачэнне транзітных таварапатокаў праз Беларусь з Захаду ў краіны СНД. У выніку ў 1999 г. указам прэзідэнта Беларусь рашэнні мясцовых органаў улады аб спагнанні розных збораў з перавозчыкаў былі адменены. Аднак праблемы недахопу і нізкай прапускной здольнасці пагранпераходаў засталіся характэрнымі для беларуска-польскай мяжы і на перспектыву.

Геаграфічнае становішча прыгранічных абласцей, падобнасць прыродных умоў і прыстасаванасць структуры эканомікі садзейнічалі развіццю пастаянных міграцыйных сувязяў Беларусі з Польшчай. Найбольшы міграцыйны абарот насельніцтва памежных тэрыторый адзначаўся ў першай палове 1990-х гг. На прыкладзе ўлічаных міграцыйных патокаў Брэсцкай вобласці з Польшчай (табліца 1) можна бачыць, што ён быў адносна невялікі і складаў, напрыклад, у 1994 г. 69 чалавек. Разам з тым, сальда міграцыі на працягу 1990-х гг. склалася адмоўным і мела ўстойліва адмоўную дынаміку ў наступныя гады. Найбольшы лік жыхароў Беларусі, выехаўшых у Польшчу, назіраўся ў 1995 і 1996 гг., калі сальда складала 39 і 36 чалавек адпаведна. Прычынамі гэтага паслужылі нестабільнае палітычнае становішча, працяг эканамічнай стагнацыі, калі востра адчувалася розніца ва ўзроўні заработных плат на памежных тэрыторыях, а беспрацоўе дасягнула свайго піку. Так, у 1996 г. на кожнае вакантнае працоўнае месца ў Брэсцкай вобласці прэтэндавалі 26 чалавек, у Гродзенскай

---

[12] Протоколи засідань ради транскордонного об’єднання Єврорегіон «Буг» за 2000–2002 рік // Державний архів Волинської області, фонд Р-3505, оп. 1, спр. 124, арк. 39.

– 29[13]. Сярэдняя заработная плата ў гэты час ў беларускіх прыгранічных абласцях ледзьве дасягала 50 дол. ЗША, у той час як у Польшчы ў 1995 г. яна складала 702,62 злотых (293 дол.)[14].

**Табліца 1 – Міграцыя насельніцтва Брэсцкай вобласці ў Польшчу (чалавек)[15]**

| Гады | Колькасць прыбыўшых | Колькасць выбыўшых | Міграцыйны абарот | Міграцыйны прырост, спад (-) |
|---|---|---|---|---|
| 1994 | 24 | 45 | 69 | -21 |
| 1995 | 8 | 47 | 55 | -39 |
| 1996 | 7 | 43 | 50 | -36 |
| 1997 | 4 | 33 | 37 | -29 |
| 1998 | 10 | 31 | 41 | -21 |
| 1999 | 7 | 20 | 27 | -13 |

Палякі таксама прыязджалі на працу ў Брэст і былі ў асноўным задзейнічаны ў галіне будаўніцтва, якая з’яўлялася найбольш прыбытковай у Беларусі. З дапамогай іх быў адрэстаўрыраваны будынак чыгуначнага вакзала станцыі «Брэст-Цэнтральны», адрамантаваны магазіны фірмы «Прадтавары», гандлёва-вытворчых прадпрыемстваў «Люблін», «Усход», вялося будаўніцтва жылля ў акцыянерным таварыстве «Дываны Брэста». Насуперак падпісанаму ў верасні 1995 г. паміж Беларуссю і Польшчай пагадненню аб узаемным працаўладкаванні грамадзян механізм яго прымянення на практыцы заставаўся не распрацаваным.

Такім чынам, характар беларуска-польскага прыгранічнага супрацоўніцтва вызначаўся шэрагам фактараў, сярод якіх вызначальную ролю адыгрываў неаднолькавы сацыяльна-эканамічны ўзровень развіцця памежных рэгіёнаў, што адбівалася на памерах заработных

13 В.С. Фатеев, *Региональные проблемы и политика в Беларуси: доклад подготовлен к междунар. науч.-практ. конф. «Региональная политика Украины: научные основы, методы, механизмы», посвящ. памяти академика АН Украины Я.С. Подстригача*, приложение к журналу «Право и экономика», 21–23 мая 1998 г., г. Львов, сер. «Экономика», Минск 2000, с. 11.

14 Przeciętne miesięczne wynagrodzenie w gospodarce narodowej w latach 1950-2010 (podstawa wymiaru emerytur i rent) // Główny Urząd Statystyczny. – http://www.stat.gov.pl/gus/5840_1630_PLK_HTML.htm (05.02.2012).

15 Складзена аўтарам на падставе дадзеных Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Брэсцкай вобласці.

плат, узроўні цэн на прадметы шырокага ўжытку. Галоўнай формай кантактаў у такіх умовах станавіўся гандаль, які ў асноўным ажыццяўлялі "чаўнакі", індывідуальныя прадпрымальнікі і дробныя фірмы.

### Інстытуцыялізацыя прыгранічных зносін

Інтэнсіўнасць развіцця прыгранічнага эканамічнага супрацоўніцтва залежала ў першую чаргу ад шэрагу фактараў, звязаных з рэгуляваннем рэжыму дзяржаўнай мяжы. У гэтай сувязі памежным краінам давялося ўрэгуляваць такія пытанні шляхам заключэння міждзяржаўных пагадненняў і стварэннем неабходных служб, што ажыццяўлялі іх палажэнні на практыцы. Згаданыя прававыя акты і службы сталі першымі неабходнымі інстытутамі прыгранічнага супрацоўніцтва. Беларуска-польскі адрэзак мяжы з'яўляўся найбольш аформленым, паколькі ў савецкія часы выконваў функцыю знешняй мяжы і быў варотамі СССР на захад. У гэтым сэнсе станаўленне пагранічнай інфраструктуры ў 1990-я гг. адбывалася не на пустым месцы. У верасні 1991 г. Беларускае ўпраўленне Дзяржаўнага мытнага кантролю СССР было пераўтворана ў Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь, якому падпарадкоўваліся ўсе мытныя органы СССР, размешчаныя на тэрыторыі Беларусі. У 1991 г. пагранічныя службы таксама выйшлі з-пад агульнасаюзнага кіравання і былі падначалены Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь. На дадзеным этапе на пунктах пропуску на беларуска-польскім участку мяжы ажыццяўлялі службу пагранічныя войскі, а таксама Брэсцкая і Гродзенская мытні, якія кантралявалі прыгранічны, міждзяржаўны і транзітны рух. Новаўтвораныя мытныя, а таксама пагранічныя службы былі зацікаўлены ў цесным супрацоўніцтве з аналагічнымі ведамствамі Рэспублікі Польшча для вырашэння агульных мэт па забеспячэнні пагранічнай бяспекі і ўрэгуляванні пасажыра- і таварапатокаў.

24 красавіка 1992 г. у Варшаве былі заключаны асноватворныя двухбаковыя пагадненні, што рэгламентавалі ажыццяўленне гранічнага руху паміж дзяржавамі і развіццё прыгранічнага супрацоўніцтва: Пагадненне па пытанні пагранпераходаў і Пагадненне аб асноўных прынцыпах трансгранічнага супрацоўніцтва. Дадзеныя дакументы

стварылі спрыяльныя ўмовы для развіцця прыгранічных кантактаў: былі абазначаны пагранічныя пераходы на беларуска-польскай мяжы, вызначана адкрыццё новых, Так, у 1992 г. дзейнічалі 3 аўтадарожныя пункты пропуску "Брэст–Тэрэспаль", "Казловічы–Кукурыкі", "Брузгі–Кузніца Беластоцкая", пазней былі адкрытыя новыя: "Дамачава–Славацічы", "Бераставіца–Баброўнікі" і "Пясчатка–Чарэмха". Праз апошні пункт пропуску ажыццяўляліся толькі двухбаковыя сувязі, а іншыя забяспечвалі міжнародныя сувязі, у тым ліку транзітныя адносна Беларусі і Польшчы.

На фоне дынамізацыі міждзяржаўных беларуска-польскіх адносін у першай палове 1990-х гг. паўстала неабходнасць адкрыцця ўзаемных дыпламатычных прадстаўніцтваў і місій, якія заклікаліся прадстаўляць інтарэсы сваёй радзімы ў суседніх краінах. 1992 г. адзначыўся адкрыццём Пасольстваў Рэспублікі Беларусь у Варшаве і Рэспублікі Польшча ў Мінску, пры якіх заснаваліся гандлёва-эканамічныя службы дзеля развіцця кантактаў паміж абедзвюма краінамі.

Але бакі былі зацікаўлены ў наяўнасці такіх прадстаўніцтваў і ў рэгіёнах, што было здольна значна актывізаваць прыгранічны рух і памежнае супрацоўніцтва. Яшчэ ў 1991 г. у беларускім Брэсце і польскай Бяла-Падлясцы адкрыліся пастаянныя прадстаўніцтвы па пытаннях знешнеэканамічнай дзейнасці, галоўнай мэтай якіх стала развіццё дзелавых кантактаў прадпрымальнікаў абодвух бакоў, узаемакарыснае супрацоўніцтва ў розных галінах эканомікі, узгодненая палітыка цэнаўтварэння, абмен гаспадарчай і прававой інфармацыяй. У 1995 г. у Гродне, а у 1996 г. у Брэсце статус генеральных атрымалі консульствы Рэспублікі Польшча. Іх супрацоўнікі выступалі ініцыятарамі шматлікіх дзелавых сустрэч з рэгіянальным кіраўніцтвам, эканамістамі і бізнесменамі Беларусі. У час такіх сустрэч, у якасці першачарговых абмяркоўваліся пытанні эканамічнага развіцця і супрацоўніцтва, наведваліся найбольш цікавыя для заходніх суседзяў прадпрыемствы.

Асобнай інстытуцыянальнай адзінкай у прыгранічным супрацоўніцтве стала створаная паводле Пагаднення аб асноўных прынцыпах трансгранічнага супрацоўніцтва Беларуска-польская міжурадавая каардынацыйная камісія па справах трансгранічнага супрацоўніцтва. Асноўнымі задачамі камісіі з'яўляліся каардынацыя агульных напрамкаў, праграм і форм трансгранічнага руху, а так-

сама разгляд спрэчных пытанняў, якія ўскладнялі гэтае ўзаемадзеянне. Камісія распрацоўвала таксама рэкамендацыі па стварэнні сумесных рэгіянальных і мясцовых каардынацыйных органаў па справах трансгранічнага супрацоўніцтва. Вялікае значэнне сумесная камісія надавала стварэнню і развіццю на беларуска-польскім памежжы еўрарэгіёнаў "Буг" і "Нёман". На першым пасяджэнні камісіі 19 красавіка 1996 г. былі ўтвораны дзве падкамісіі: прыгранічнага і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. У кампетэнцыю першай падкамісіі ўваходзілі пытанні ўдасканалення прыгранічнай інфраструктуры, сумесныя праграмы па ахове навакольнага асяроддзя, развіццё турызму, спрыянне сувязям у сферы эканомікі, культуры і адукацыі, абмен вопытам працы паміж органамі мясцовай улады Рэспублікі Беларусь і органамі самакіравання Рэспублікі Польшча, абмен моладзю, супрацоўніцтва ў рамках еўрарэгіёнаў. Старшынёй беларускай часткі падкамісіі быў прызначаны намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама У. Чорны, польскай часткі – ваявода Бялападляскага ваяводства Т. Коршань. Аднак рэальную дзейнасць падкамісія па прыгранічным супрацоўніцтве пачала толькі ў 2000-я гг.

Яшчэ адным інстытуцыянальным блокам прыгранічнага супрацоўніцтва сталі пагадненні, што заключалася паміж рэгіянальнымі і мясцовымі органамі ўлады і кіравання памежных краін. Дадзеныя пагадненні пачалі заключацца з пачатку 1990-х гг. і былі накіраваны ў першую чаргу на рашэнне праблем эканамічнага характару, звязаных з дэфіцытам грашовых сродкаў прадпрыемстваў, што ажыццяўлялі знешнеэканамічныя сувязі, з валютнымі канвертацыямі, правядзеннем бартэрных аперацый. Брэсцкай вобласцю традыцыйна падтрымліваліся парнёрскія сувязі з Бялападляскім і Люблінскім ваяводствамі, а Гродзенская вобласць цесна супрацоўнічала з памежнымі Беластоцкім і Сувалкаўскім ваяводствамі. У верасні 1991 г. быў падпісаны дагавор аб стасунках паміж Брэстам і Бяла-Падляскай, у лістападзе 1991 г. – пагадненне паміж выканаўчым камітэтам Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў і Упраўленнем Люблінскага ваяводства, у красавіку 1995 г. – пагадненне аб супрацоўніцтве Брэсцкай вобласці з Бялападляскім ваяводствам, а ў студзені 1997 г. у працяг гэтага пагаднення – пратакол аб развіцці двухбаковых сувязяў у галіне эканомікі, культуры, спорту, медыцыны і аховы навакольнага асяроддзя. У 1995 г. былі заключаны пагадненні паміж Гродзенскай

вобласцю і Сувалкаўскім ваяводствам аб развіцці прыгранічных гаспадарчых і культурных сувязяў, а таксама з Беластоцкім і Альштынскім ваяводствамі. Эфектыўнасць рэалізацыі дадзеных дамоў у наступныя гады даказана на практыцы, асабліва на прыкладзе ўзаемадзеяння памежных прадпрыемстваў.

Дагаворы і пагадненні аб двухбаковым супрацоўніцтве, падпісаныя паміж прыгранічнымі рэгіёнамі ў 1990-х гг., з'явіліся трывалай прававой базай для развіцця кантактаў у разнастайных накірунках дзейнасці. У наступныя гады яны не гублялі сваёй значнасці, а толькі пашыраліся і паступова выліліся ў супрацоўніцтва ў рамках еўрарэгіёнаў «Нёман» і «Буг». Менавіта еўрарэгіёны сталі найбольш дасканалым і ўніверсальным інстытутам прыгранічнага супрацоўніцтва. Зладжаннаму супрацоўніцтву спрыялі наяўнасць агульных органаў кіравання: Савет (па 10 чалавек ад кожнага боку), Прэзідыум Савета (па 1 чалавеку), нацыянальныя сакратарыяты і працоўныя групы па ўсіх напрамках ўзаемадзеянняў. На рэгіянальным узроўні найбольш відавочнай выглядала праца нацыянальных сакратарыятаў. Як правіла, дадзены орган набываў асобны статус, але на беларускай частцы еўрарэгіёнаў яго члены часта з'яўляліся супрацоўнікамі мясцовых аблвыканкамаў. З аднаго боку, такое сумяшчэнне дзейнасці выглядала дапаўненнем і нагрузкай да асноўных функцыянальных абавязкаў, а з другога – разумным выкарыстаннем кампетэнтнасці дадзеных супрацоўнікаў. Так, нацыянальны сакратарыят еўрарэгіёна "Буг", што размяшчаўся ў Брэсце, узначальваў У. Цележынскі, кіраўнік аддзела знешнеэканамічных сувязяў Брэсцкага аблвынкама; ён дасканала валодаў вопытам вядзення адпаведнай працы.

Як бачна, беларуска-польскае прыгранічнае супрацоўніцтва трымалася на шырокай інстытуцыянальнай аснове, прадстаўленай шэрагам службаў: мытнай, пагранічнай, дыпламатычнай, двухбаковымі камісіямі, а таксама прававымі актамі, складзенымі з трох груп: нацыянальнай, міждзяржаўнай і міжрэгіянальнай. Калі апошнія дзве групы атрымалі развіццё, то нацыянальная нарматыўна-прававая база, якая б рэгламентавала развіццё прыгранічнага, а таксама трансгранічнага супрацоўніцтва, амаль адсутнічала. Яна прадстаўлена толькі ўнутранымі законамі, якія рэгулявалі ў цэлым знешнеэкамічную дзейнасць краіны і радзей – яе двухбаковыя адносіны з сумежнымі дзяржавамі.

## Развіццё эканамічных кантактаў паміж прыгранічнымі тэрыторыямі

У пачатку 1990-х гг. эканамічныя адносіны паміж прыгранічнымі суб'ектамі гаспадарання развіваліся не спантанна, а набылі больш-менш упарадкаваны характар. Гаспадарчыя сувязі рэгулявалі створаныя сумесныя двухбаковыя арганізацыі, а таксама спецыялізаваныя прадпрыемствы, што размяшчаліся на тэрыторыі суседзяў. Так, у пашырэнні гандлёва-эканамічных адносін, пошуку новых форм узаемадзеяння паміж арганізацыямі і прадпрыемствамі Беларусі і Польшчы значную ролю выконвалі створаныя ў 1991 г. Беларуска-польскі гандлёвы дом, які стварыў філіялы ў Гродне і Брэсце, а таксама Польска-беларуская гандлёвая палата (1992 г.). Гэтыя структуры разгарнулі значную працу па павелічэнні пасрэдніцкіх аперацый, пашырэнні магчымасцей закупак тавараў народнага спажывання на ўмовах бартэрных здзелак, камісійнага, пасылачнага і іншых форм гандлю, а таксама ладзілі рэгулярныя сустрэчы з прадстаўнікамі фірм, выставы тавараў у абедзвюх краінах. Дарэчы, выстаўкі, ярмаркі і асабістыя кантакты даказалі здольнасць актывізаваць прадпрымальніцкую дзейнасць. У 1993 г. ужо 27 % гандлёвага абароту Рэспублікі Беларусь з'явіліся вынікам кантрактаў, заключанных пры дапамозе такіх мерапрыемстваў[16].

На працягу 1990-х гг. па абодва бакі мяжы ўзнік шэраг аб'яднанняў і арганізацый, што займаліся наладжваннем міжнародных эканамічных сувязей, каардынацыяй кантактаў, прапагандай патэнцыяльных магчымасцей свайго рэгіёну. У гэтым пераліку неабходна адзначыць дзейнасць біржаў «Гродна – Захад» (правядзенне міжнародных селектарна-камп'ютарных таргоў), Усходняй біржы ў Беластоку (арганізацыя ярмарак сельскагаспадарчых прадуктаў і тэхнікі), Усходняга эканамічнага таварыства, у склад якога ўвайшлі 53 фірмы з Беластоцкага ваяводства (паслугі ў сферы сельскай гаспадаркі, лёгкай прамысловасці, будаўніцтва), а таксама гандлёва-прамысловыя палаты ў Беластоку, Гродне і Брэсце, паміж якімі дзейнічалі пагадненні аб супрацоўніцтве, і інш. У 1995 г. у Гродне заснавана Поль-

---

16 Документы об экономическом и научно-техническом сотрудничестве с зарубежными странами и международными организациями (проекты постановлений, распоряжения, информации и др.), т. 4, НАРБ, фонд 7, оп. 12, д. 752, д. 33.

ская палата па гандлі і эканамічным супрацоўніцтве, якая занялася прасоўваннем польскіх тавараў на беларускі рынак і кантралявала такія напрамкі супрацоўніцтва як сельская гаспадарка, харчовaперапрацоўчая і фармацэўтычная прамысловасць, вытворчасць медыцынскай апаратуры, будаўнічыя матэрыялы і энэргетыка. Па ініцыятыве Беластоцкай гандлёва-прамысловай палаты была арганізавана сумесна з гандлёва-прамысловай палатай пры Саюзе палякаў Беларусі пастаянна дзеючая выстава польскіх тавараў у Гродне[17]. Паміж Саюзам прадпрымальнікаў Беларусі і Варшаўскай рамеснай палатай было падпісана пагадненне, якое прадугледжвала інфармацыйны абмен і сумеснае правядзенне ярмарак пад дэвізам “1001 дробязь” (г. Мінск, ліпень 1993 г.). У Польшчы штогод праходзілі Міжнародныя пагранічныя таргі “Усход–Захад” (г. Бяла-Падляска, май 1993 г.), у якіх прымалі ўдзел беларускія вытворцы. У 1997 г. на міжнароднай выставе-ярмарцы “Мэбля-97” у Познані былі прадстаўлены ўзоры аб’яднання “Пінскдрэў”, якія атрымалі высокую ацэнку экспертаў. Як бачна, згаданыя мерапрыемствы станавіліся пазітыўным штуршком для заключэння новых кантрактаў і дагавораў, што ў сваю чаргу служыла развіццю і стабілізацыі тварнага рынку Беларусі, прыцягненню з-за мяжы валютных сродкаў і імпартных тавараў, а таксама істотна актывізавала вытворчую дзейнасць прадпрыемстваў на сумежжы.

Створаныя эканамічныя інстытуты каардынавалі дзейнасць прадпрыемстваў памежжа, дазвалялі рацыянальна размяркоўваць эканамічны патэнцыял прыгранічных рэгіёнаў, спрыялі рашэнню шэрагу задач, узнікшых перад суб’ектамі гаспадарання. Была закладзена трывалая платформа для дзелавых узаемаадносін, што спрыяла афармленню доўгатэрміновых сувязяў і вяло да інстытуцыйнай разнастайнасці прыгранічнага эканамічнага супрацоўніцтва. Вынікам такой дзейнасці стала станоўчая дынаміка развіцця гандлёвых адносін (табліца 2).

[17] Польша – Беларусь: перспективы развития приграничного сотрудничества, [в:] „Белорусская газета”, № 14 (апрель), Минск 1996, с. 19.

**Табліца 2 – Знешні гандаль Брэсцкай вобласці з Рэспублікай Польшча (млн. дол. ЗША) 18**

| Напрамак гандлю | Гады | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1994 | 1995 | 1997 | 1998 | 1999 |
| Экспарт тавараў | 6,8 | 9,2 | 11,2 | 10,9 | 10,2 |
| Імпарт тавараў | – | 9,1 | 29,2 | 30,0 | 23,0 |

– дадзеныя адсутнічаюць

Асабліва плённа з польскім бокам супрацоўнічалі беларускія прыгранічныя лесагаспадарчыя прадпрыемствы, якія выгадна для сябе прадавалі дробнатаварную драўніну, што нарыхтоўвалася на высечках пры даглядзе за лесам. Брэсцкія прадпрыемствы наладзілі цесныя сувязі з дзвюма польскімі фірмамі – "Стэфан Піёнскі" і "Віеман", якія ахвотна на Брэстчыне закуплялі мэблевую дошку.

Новай формай эканамічнага супрацоўніцтва памежных тэрыторый, занатаванай згаданымі вышэй міжрэгіянальнымі дамовамі, стала стварэнне сумесных прадпрыемстваў (СП) і прадпрыемстваў з замежнымі інвестыцыямі (ЗП). На тэрыторыі Брэсцкай вобласці з удзелам інвестараў з Бялападляскага ваяводства былі адкрыты 16 сумесных і 17 замежных прадпрыемстваў (дадзеныя на 1997 г.)[19]. Найбольш паспяховымі з'яўляліся такія ЗП, як "Саманта-Поліш", "Бос-Буд-Брэст", "Ток Компані", "Еўра-Аўта", "Алімекс". Асноўнай сферай іх дзейнасці з'явілася гандлёва-закупачная і пасрэдніцкая, што ў пераважнай ступені абумоўлівалася геаграфічным становішчам Брэсцкай вобласці і наяўнасцю развітай камунікацыйнай сістэмы, калі частка тавараў і паслуг пастаўляліся на рынкі Расіі і іншых краін СНД. Так, у сакавіку 1992 г. у Брэсце Гандлёва-прамысловай палатай Рэспублікі Беларусь, Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам і Гандлёва-прамысловай палатай Рэспублікі Польшча была заснавана фірма "Белінвестцэнтр" са 100-працэнтным замежным капіталам Цэнтра "Усход – Захад" (г. Варшава). Мэта стварэння фірмы –

[18] Народное хозяйство Брестской области: Стат. ежегодник / Брест. обл. управление статистики, Брест 2000, с. 338; Основные показатели развития Брестской области : краткий сб. / Брест. обл. управление статистики, Брест 1998, с. 69.

[19] В. Степанов, *Трансграничное сотрудничество в развитии Брестской области* / В. Степанов, Брест 1997, № 3, с. 15.

садзейнічанне развіццю гандлёва-эканамічных сувязяў паміж Беларуссю, Польшчай і іншымі краінамі. У 1992 г. "Белінвестцэнтр" заключыў кантракт з прадпрыемствамі Свярдлоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі на пастаўку ў Беларусь каляровых металаў з правам рээкспарту ў Польшчу. Сума кантракта склала 13 млн. дол. ЗША. У разлік гэтай сумы прадугледжваліся пастаўкі ў Расію прадуктаў харчавання з Польшчы праз Беларусь. Як пасрэднік, беларускі бок атрымаў ад рэалізацыі дадзенага кантракту 30 % альбо 3,9 млн. дол. За гэты кошт фірма набыла для прадпрыемстваў Беларусі частку неабходных тавараў як з Расіі (каляровыя металы), так і з Польшчы (прадукты харчавання). Такім чынам, падобныя знешнеэканамічныя аперацыі аказаліся выгаднымі адначасова для трох бакоў.

Пасрэдніцкія паслугі паміж Расіяй і Польшчай ажыццяўляла Беларусь і ў сферы энергетыкі, што можна праілюстраваць на прыкладзе газаправода, па якому газ паступаў у напрамку Ваўкавыск–Беласток, а таксама энергетычнай лініі з п. Рось Гродзенскай вобласці ў Беласток напружаннем 220 КВ. Разам з тым, у той час планавалася злучыць энергетычныя сістэмы гарадоў Брэста і Бяла-Падляскі, так як уласных электрастанцый у Люблінскім ваяводстве не было, і палякі вымушаны былі набываць электраэнергію з другіх рэгіёнаў.

У Гродзенскай вобласці на пачатак 1998 г. было зарэгістравана 40 СП і 11 ЗП з польскім капіталам, сфера дзейнасці якіх пераважна ахоплівала гандаль, вытворчасць прадуктаў харчавання, перапрацоўку драўніны і сельскагаспадарчай прадукцыі[20].

У галіне сельскагаспадарчай вытворчасці памежнае супрацоўніцтва развівалася менш актыўна. У асноўным яно ажыццяўлялася шляхам наладжвання сувязяў паміж беларускімі калгасамі і польскімі фермерамі, зводзілася ў асноўным да абмену тэхналогіямі вырошчвання раслін, барацьбы са шкоднымі насякомымі, вядзення жывёлагадоўлі. У 1990 г. праўленне калгаса імя М.Ф. Дзімітрава Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці заключыла пагадненне аб супрацоўніцтве з польскімі фермерамі. У выніку супрацоўніцтва беларускі бок атрымаў новую тэхналогію вырошчвання і засолкі агуркоў, якія карысталіся вялікім попытам і далі калгасу значны прыбытак. Калгас "40 год Кастрычніка" Столінскага раёна Брэсцкай вобласці з

[20] О развитии торгово-экономических отношений с Польшей // Текущий архив Управления внешних экономических связей Брестского облисполкома, Папка: «Трансграничное объединение Еврорегион «Буг» (переписка)», Brześć 1998.

1993 г. паспяхова рэалізоўваў у Польшчу плеценыя з лазы кошыкі, якія закупляў у мясцовага насельніцтва. Паступова асартымент плеценай прадукцыі быў пашыраны, і ў Польшчу пачалі прадаваць мэблю – плеценыя крэслы, тумбачкі, этажэркі. Аднак стрымліваючымі фактарамі развіцця сельскагаспадарчых кантактаў на памежных тэрыторыях аказаліся неаднолькавы ўзровень развіцця рынкавых адносін, узаемавыключныя формы гаспадарання, з якіх вынікалі розная ступень адказнасці суб'ектаў гаспадарання, а таксама цяжкасці, звязаныя з цэнаўтварэннем.

Па меры актывізацыі прыгранічных сувязяў у пачатку 1990-х гг. пашыраліся транспартныя зносіны жыхароў Беларусі і Польшчы шляхам павелічэння рэгулярных маршрутаў. У 1992 г. беларускі бок разам з польскімі прадпрыемствамі на парытэтных умовах арганізаваў 10 міжнародных аўтобусных маршрутаў, на якіх за суткі выконваліся 22 рэйсы. Але нават пашыраныя аб'ёмы перавозак не забяспечвалі ўзрастаючыя патрэбы насельніцтва. У сувязі з гэтым беларускія аўтобусныя паркі дадаткова ўвялі 6 новых міждзяржаўных маршрутаў: Гомель–Варшава, Магілёў–Торунь, Віцебск–Варшава, Мінск–Варшава, Мінск–Ольштын, Мінск–Люблін. Аднак рэгулярная эксплуатацыя дадзеных маршрутаў стрымлівалася з-за абмежаваных прапускных здольнасцяў пагранічных пунктаў пропуску. У 1993 г. колькасць рэгулярных аўтобусных рэйсаў праз мяжу на пагранпераходзе Кузніца складала 26 (разам з транзітнымі маршрутамі). У 1992–1994 гг. былі ўведзены ў эксплуатацыю кароткія прыгранічныя аўтобусныя маршруты, сярод якіх Брэст–Варшава; Сакулка–Гродна (42 рэйсы); Беласток–Гродна–Мінск (6 ліній); Баранавічы–Беласток; па цотных днях – Камянец–Брэст–Бяла-Падляска. Разам з тым, насельніцтва інтэнсіўна выкарыстоўвала і чыгуначны транспарт. Гродна і Брэст дадаткова з'яўляліся камунікацыйнымі вузламі, забяспечваючы рух на Варшаву і Беласток. Напрыклад, праз Брэсцкія вароты курсіравалі 4 пары цягнікоў па маршруце Брэст–Тэрэспаль, Брэст–Седльцэ і 1 пара – Брэст–Высока-Літоўск, якія задавальнялі патрэбы той часткі насельніцтва, што жадала з Брэста трапіць у Беласток. Больш таго, праз Брэсцкі вакзал праходзіла шмат транзітных саставаў з Расіі і краін СНД у Еўропу. У 1992 г. сфарміраваўся новы камерцыйны маршрут Магілёў–Сакулка, які курсіраваў 3 разы штотыдзень,

таксама былі заснаваны прамыя чыгуначныя зносіны паміж Гомелем і Варшавай (2 разы на тыдзень).

У наладжванні прыгранічнага эканамічнага супрацоўніцтва важную ролю адыграла наяўнасць прамой тэлефоннай сувязі, што значна спрашчала кантакты паміж прадпрымальнікамі. Так, у пачатку 1990-х гг. аўтаматычная тэлефонная сувязь была ўстаноўлена паміж Беластоцкім ваяводствам і ўсёй тэрыторыяй Беларусі, а таксама паміж Брэсцкай вобласцю і Бяла-Падляскім ваяводствам.

## Заключэнне

Такім чынам, у 1990-я гг. прыгранічныя беларуска-польскія тэрыторыі сталі абсяжнай прасторай для разгортвання разнастайных форм эканамічнага супрацоўніцтва на памежжы. Яго эканамічны эфект у значнай ступені залежаў ад ініцыятыўнасці мясцовых органаў улады, устаноў і арганізацый, што развівалі гаспадарчыя сувязі, а таксама ад ступені спрыяльнасці кантактам мясцовага насельніцтва памежных краін. На пачатку 1990-х гг. асноўнымі формамі ўзаемадзеяння выступаў бартэрны абмен, набыўшы размах на ўзроўні буйных прадпрыемстваў і сярод асобных людзей, а таксама папулярны сярод насельніцтва па абодва бакі мяжы чаўночны бізнес. Тады ж складваліся ўмовы і канцэнтраваўся важкі патэнцыял для прыцягнення замежных інвестыцый, нарошчвання экспартных паставак у суседнія краіны. Таму на працягу 1990-х гг. назіралася станоўчая дынаміка стварэння сумесных і замежных прадпрыемстваў з польскім капіталам, іх прыцягальная сфера дзейнасці ахапіла гандаль, харчовую прамысловасць, перапрацоўку драўніны і сельскагаспадарчай прадукцыі. Дзякуючы сваім транзітным перавагам, заходняе беларускае памежжа аказалася своеасаблівым трамплінам для паставак польскай прадукцыі на шырокія рынкі Расіі і іншых краін СНД. У сувязі з гэтым менавіта на тэрыторыі Брэстчыны, праз якую пралягаюць асноўныя гандлёва-эканамічныя шляхі паміж Захадам і Усходам Еўропы, набылі распаўсюджанне прадпрыемствы-пасрэднікі.

Разам з тым, развіццё прыгранічнага супрацоўніцтва Беларусі і Польшчы стрымлівалася шэрагам праблем і нявырашаных пытанняў. Значныя перашкоды пашырэнню гаспадарчых кантактаў ства-

ралі на дзяржаўнай мяжы няразвітая прыгранічная інфраструктура і ўзмоцненая жорсткасць прапускнога рэжыму ў канцы 1990-х гг., павелічэнне ўвазных пошлін на беларускія тавары. Індывідуальныя прадпрымальнікі і прадстаўнікі сярэдняга бізнесу не знаходзілі дастатковых абаротных сродкаў для вядзення знешнеэканамічных аперацый, таму што значная доля фінансаў трацілася на мытнае афармленне тавараў, пагашэнне іншых тарыфных плацяжоў пры прыгранічных і транзітных зносінах. Гэта значна скарачала сацыяльную базу прыгранічнага эканамічнага супрацоўніцтва. Абмяжоўвалі развіццё гандлёвых кантактаў неадпаведнасць унутранага заканадаўства памежных краін у пытаннях рэгулявання і ліцэнзавання экспарту і імпарту, умовах вядзення бізнесу, а нярэдка звычайнае няведанне гаспадарчых пераваг бліжэйшых суседзяў. Больш сціплыя паўнамоцтвы беларускіх рэгіянальных органаў улады адносна польскіх у вядзенні прыгранічнага супрацоўніцтва, а таксама недастатковыя памеры фінансавання рэгіёнаў стрымлівалі вырашэнне агульных праблем беларуска-польскага памежжа, удзел у сумесных праграмах, што прапаноўваў Еўрасаюз. Нягледзячы на тое, што на працягу 1990-х гг. быў створаны разнастайны інстытуцыянальны механізм прыгранічнага супрацоўніцтва, беларускі бок не меў нацыянальнай нарматыўна-прававой базы для рэгулявання прыгранічных кантактаў. Тым не менш, у другой палове 1990-х гг. памежныя тэрыторыі набылі новы вопыт паглыбленага ўзаемадзення, які перарос ў больш высокую ступень арганізаванасці і развіваўся ў форме супрацоўнітцва ў рамках еўрарэгіёнаў “Нёман” і “Буг”.

Неспрыяльны фон прыгранічнаму супрацоўніцтву надавалі і палітычныя супярэчнасці, што эпізадычна ўзнікалі ў беларуска-польскіх міждзяржаўных адносінах другой паловы 1990-х гг. Аднак нягледзячы на іх існаванне прыгранічныя рэгіёны сумежжа выказваліся за паглыбленне кантактаў і ажыццяўлялі такія памкненні на практыцы, пазбягаючы парушэння заканадаўстваў сваіх дзяржаў. Плённае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва памежжа Беларусі і Польшчы заставалася трывалай асновай у справе замацавання добрасуседскіх адносін паміж абедзвюма краінамі.

## Библиография

Бартерный … праздник дружбы [в:] „Заря", 1990, 21 сентября

Бурик Е.А., *Проблемы развития пограничных переходов на белорусско-польской границе в первой половине 1990-х гг.* [в:] Веснік Брэсцкага ўніверсітэта, сер. 2. Гісторыя. Эканоміка. Права, № 1, Брэст 2011, с. 5–13

Документы о постановке предприятиями и организациями республики продукции на экспорт (справки, информации, сведения), т. 1, Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), фонд 7, оп. 12, д. 417, л. 61

Документы о рассмотрении вопросов создания совместных предприятий и их внешнеэкономической и организационно-хозяйственной деятельности (проекты распоряжений, приказы, переписка и др.), т. 1, НАРБ, фонд 7, оп. 12, д. 411, л. 145

Документы об экономическом и научно-техническом сотрудничестве с зарубежными странами и международными организациями (проекты постановлений, распоряжения, информации и др.), т. 4, НАРБ, фонд 7, оп. 12, д. 752, д. 33

Европейская рамочная конвенция о приграничном сотрудничестве территориальных сообществ и властей, Мадрид, 21 мая 1980 г. СДСЕ №: 106 // Совет Европы: Бюро договоров [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://conventions.coe.int/treaty/rus/Treaties/Html/106.htm. – Дата доступа: 27.01.2010

Народное хозяйство Брестской области: Стат. ежегодник / Брест. обл. управление статистики, Брест 2000, с. 338; Основные показатели развития Брестской области: краткий сб. / Брест. обл. управление статистики, Брест 1998, с. 69

О развитии торгово-экономических отношений с Польшей // Текущий архив Управления внешних экономических связей Брестского облисполкома, Папка: «Трансграничное объединение Еврорегион «Буг» (переписка)», Brześć 1998

Переписка с Советом министров РБ по вопросам удовлетворения культурных потребностей польского национального меньшинства в Беларуси, развития электротранспорта, использования высвобождающихся военных городков и др. // Государственный архив Гродненской области, фонд 1171, оп. 5, д. 2970, л. 300

Польша – Беларусь: перспективы развития приграничного сотрудничества, [в:] „Белорусская газета", № 14 (апрель), Минск 1996, с. 19

Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 03.02.1992 N 50 «О квотировании и лицензировании экспорта и импорта товаров (работ, услуг) на территории Республики Беларусь в 1992 году» // Режим доступа: http://www.pravoby.info/docum09/part36/akt36068.htm. – Дата доступа: 13.04.2011; Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 06.02.1992 N 63 «О формировании валютных фондов в 1992 году» // Режим доступа: http://www.pravoby.info/docum09/part36/akt36063.htm. – Дата доступа: 13.04.2011

Протоколи засідань ради транскордонного об'єднання Єврорегіон «Буг» за 2000–2002 рік // Державний архів Волинської області, фонд Р-3505, оп. 1, спр. 124, арк. 39

Складзена аўтарам на падставе дадзеных Галоўнага статыстычнага ўпраўлення Брэсцкай вобласці

Степанов В., *Трансграничное сотрудничество в развитии Брестской области* / Степанов В., Брест 1997, № 3, с. 15

Фатеев В.С., *Региональные проблемы и политика в Беларуси: доклад подготовлен к междунар. науч.-практ. конф. «Региональная политика Украины: научные основы, методы, механизмы», посвящ. памяти академика АН Украины Я.С. Подстригача*, приложение к журналу «Право и экономика», 21–23 мая 1998 г., г. Львов, сер. «Экономика», Минск 2000, с. 11

Цены в Беларуси 1991–2005 : статистический сборник / Министерство статистики и анализа Респ. Беларусь, Минск 2006, с. 167

Часноўскі М.Э., *Сістэмныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Польшча (1989–1999)* / Часноўскі М.Э., Мінск 2000, с. 242

Przeciętne miesięczne wynagrodzenie w gospodarce narodowej w latach 1950-2010 (podstawa wymiaru emerytur i rent) // Główny Urząd Statystyczny. – http://www.stat.gov.pl/gus/5840_1630_PLK_HTML.htm. – 05.02.2012

**Summary**

## Belarusian-Polish border cooperation in the economic sphere in the 1990s

In this article the author examines establishment and development of Belarusian-Polish cooperation in the economic sphere in the first post-socialist years. The author determines the main forms of economic cooperation; she characterizes social-economic conditions of development of border regions. The researcher emphasizes different economic potential of Belarusian and Polish border areas. It was a reason for the activization of border cooperation. One of the most successful forms of this cooperation became Euroregions. The author underlines that a significant role in increasing trade contacts played such economic institutes as joint trading houses and the Chamber of Commerce. The researcher analyses problems and deterrents of economic partnership, she shows that strict customs and border control became the main barrier to the development of this cooperation.

**Keywords:**
Economy, Euroregions, Belarusian-Polish cooperation